

**ЛАБАНОК**
**Уладзімір Елісеевіч**
**ЛОБАНОК**
**Владимир Елисеевич**

Чашніцкая выбарчая акруга № 277 Віцебскай вобласці.

Нарадзіўся ў 1907 г. Беларус. Член КПСС з 1930 г. Адукацыя вышэйшая — закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію і Завочную Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС. Герой Савецкага Саюза.

З 1923 г. вучыўся ў Мар'інагорскім сельскагаспадарчым тэхнікуме, працаваў аграномам Народнага Камісарыята земляробства БССР, аграномам-эканамістам упаўнаважанага Наркамата саўгасаў СССР па Беларускай ССР, а з 1934 па 1941 г.— дырэктарам Беліцкага, а затым Смальянскага сельскагаспадарчых тэхнікумаў Віцебскай вобласці.

У 1941 г. выбран першым сакратаром Лепельскага райкома Кампартыі Беларусі. У гады Вялікай Айчыннай вайны ўзначальваў Лепельскі падпольны райком Кампартыі Беларусі, камандаваў партызанскай брыгадай, а затым — злучэннем партызанскіх брыгад Полацка-Лепельскай партызанскай зоны.

1944—1946 гг.— намеснік загадчыка сельскагаспадарчага аддзела ЦК Кампартыі Беларусі, старшыня Полацкага аблвыканкома.

У 1946 г. выбраны другім, затым першым сакратаром Палескага абкома Кампартыі Беларусі. 1954—1956 гг.— старшыня Гомельскага аблвыканкома. У 1956 г. выбіраецца першым сакратаром Віцебскага абкома Кампартыі Беларусі. З 1962 г.— першы намеснік Старшыні Савета Міністраў Беларускай ССР. У 1974 г. выбраны намеснікам Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Кандыдат у члены Бюро ЦК Кампартыі Беларусі.

Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР.

Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР трэцяга, шостага, сёмага, восьмага і дзевятага скліканняў.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы